Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 САКАВІКА 2017 г. СУБОТА № 57 (28421)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Павел Латушка пра Караткевіча і Францыю

СТАР. 7



Хто атрымае «Хрустальную Паўлінку»?

СТАР. 12



Жылі-былі старадарожскія сакуны

СТАР. 19

# ЧАС СЕЯЦЬ ХЛЕБ

## Мірная стваральная праца — галоўны складнік бяспекі

**Учора кіраўнік дзяржавы здзейсніў рабочую паездку ў Гродзенскую вобласць. Аляксандр Лукашэнка наведаў раённае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Саўгас «Лідскі» і замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «АРВІБЕЛАГРА».**

Візіт кіраўніка дзяржавы ў сельскую мясцовасць звязаны з пачаткам пасяўной кампаніі. Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам весновых палявых работ у рэгіёне. Ён запатрабаваў сеяць і вырошчваць сельскагаспадарчыя культуры толькі з выкарыстаннем угнаенняў, выконваць усе неабходныя тэхналагічныя працэсы. Прэзідэнту прадэманстравалі распрацаваныя і створаныя на беларускіх прадпрыемствах машыны для ўнясення мінеральных і арганічных угнаенняў, лінейку плугоў, якія выпускаюцца мясцовым Мінойтаўскім рамонтным заводам, а таксама першы ў Беларусі самаходны апырсквальнік вытворчасці «Лідаграпраммаша».

СТАР. 2

# ШЧАСЦЕ ВЫЙШЛА НА ШПАЦЫР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Работа са зваротамі грамадзян у гарадах і раёнах краіны вядзецца па-рознаму, вынікі таксама адрозніваюцца. Там, дзе больш удзяляюць увагі растлумачальнай рабоце з насельніцтвам па месцы жыхарства, дзе актыўна праводзяцца прыёмы грамадзян, там і пытанняў менш па ўсіх кірунках. Дзесьці людзей больш хвалююць пытанні занятасці, а дзесьці — практычна няма праблем з працаўладкаваннем — гэта значыць, яны паспяхова вырашаны. Стварэнне новых вытворчасцяў і стварэнне новых працоўных месцаў на перспектыву — гэта вельмі важна, гэта — тое, пра што кажа кіраўнік нашай дзяржавы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8808 | ▼ |
| Еўра | 2,0268 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0693 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Акцэнт на здароўе

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ ЛЕАНІДА

## Зрабіць унікальную аперацыю на сэрцы медыкам дапамог 3D-прынтар

**Гамяльчаніну Леаніду Вохміну 42 гады. Шчаслівчык. Яго бацька, дзед і дзедаў брат памерлі якраз у 40. Бацька аднойчы ўпаў як падкошаны і загінуў ад кровазліцця ў мозг. Але чаму ўпаў? Сваякі палічылі, сурочыў нехта. Але, хутчэй за ўсё, мужчыны з роду Вохміных гінулі па прычыне досыць рэдкага захворвання. У Леаніда яго выявілі літаральна паўгода таму, і з таго часу лёс абраў яго першым для выканання ўнікальнай для нашай краіны аперацыі на сэрцы з дапамогай сучасных тэхналогій. 27 студзеня аперацыйнае ўмяшанне было паспяхова праведзена брыгадай спецыялістаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія».**



Фота Надзеі БУЖАН.

— У дзяцінстве, памятаю, набегаешся, і перад вачамі зорачкі мільгаюць, — можа, гэта былі прадвеснікі майго захворвання? — разважае Леанід. — Дарэчы, я скончыў Чарнігаўскае лётнае вучылішча, далей трэба было прыняць украінскую прысягу (тады разваліўся Саюз!), я не захацеў і пайшоў у армію. Усё ў мяне было са здароўем нармальна. Сэрца крыху калола, але хто ж думаў? Паступова стала амаль немагчыма падняцца па лесвіцы, не мог нармальна дыхаць. І вось недзе год таму разбалелася левае плячо. Прыйшоў да аднаго ўрача, а той накіраваў да кардыёлага. Пасля для пацвярджэння дыягназу накіравалі ў Мінск. Зрабілі кардыяграму, ультрагук — дыягназ пацвердзіўся... Хірургі Андрушчук і Адзінцоў сказалі, што будуць рабіць новую аперацыю. Я не напалохаўся, бо падумаў, што гэта ў нас такіх не рабілі, а ў іншых краінах, пэўна, выканалі іх шмат...

СТАР. 5

■ Круглы стол

# ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА: ЧЫМ ВАБІЦЬ І ЧЫМ ПАЛОХАЕ?

**Вясной у ВНУ традыцыйна пачынаецца размеркаванне. Для выпускнікоў, што вучыліся на бюджэце, працэдура хвалюючая: з першым працоўным месцам звязаны і страхі, і надзеі. Для прадпрыемстваў маладыя спецыялісты таксама латарэя. Наколькі наймальнікі зацікаўлены прадастаўляць першае працоўнае месца выпускнікам? Чаго чакаюць ад нядаўніх студэнтаў? Якія прывілеі дае статус маладога спецыяліста?**

**Гэтыя і іншыя актуальныя пытанні мы абмеркавалі разам з начальнікам упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алегам ТОКУНАМ, начальнікам упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Лагойскага райвыканкама Аленай ПАЗУХІНАЙ і намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктарам сельгаспрадпрыемства «Азярыцкае-Агра» Нінай ЖАЛЯЗНОВАЙ, намеснікам начальніка ўпраўлення персаналу холдынга «Інтэграл» Аленай САВЕНЯЙ і дырэктарам Цэнтра прафесійнага навучання персаналу прадпрыемства «АМКАДОР» — кіруючая кампанія холдынга» Ірынай ВЯЗІЦКАЙ.**

СТАР. 6